Ба
20971

…ЕННЕ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ НКА БССР

891
К-95

А. КУЧАР

# ТВОРЧАСЦЬ
# М. БАГДАНОВІЧА

(МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКА
БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ)

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

МІНСК 1939

Ба 20971

УПРАЎЛЕННЕ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ НКА БССР

А. КУЧАР

# ТВОРЧАСЦЬ
# М. БАГДАНОВІЧА

(МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКА
БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ)

Інв. 1953 4А 20971/бр.
Бел. аддзел 1994 г.
БССР Дзяржаўная бібліятэка імені ЛЕНІНА

МІНСК 1939

Максім Багдановіч — майстар невялікага лірычнага верша. Верш яго заўсёды, бадай, лірычны—г. з. напісаны ад імя самога паэта і гаворыць пра пачуцці самога паэта... Вечар, насоўваецца змрок і ў думках паэта пачынаюць ужо з'яўляцца абрысы казачных істот. Гэты вячэрні змрок навявае яму пэўны душэўны стан, і ён выліваецца ў форму невялікага верша. Завіруха, мяцеліца, адкрытая магіла, цікавы гістарычны факт, прачытаны ў кнігах, філасофская думка, змрочныя, скульптурна-чоткія вобразы народнага эпаса—усё гэта тэмы для паэзіі М. Багдановіча. Наколькі ўяўныя (прызрачныя) і неакрэсленыя не былі-б адчуванні паэта, наколькі нязначным не з'яўляўся-б факт, у яго ён знаходзіць заўсёды акрэсленую лірычную кампазіцыю (размяшчэнне частак, разгортванне пачуцця, узаемаадносіны і паслядоўнасць паэтычных дэталяў).

М. Багдановіч часта выступаў з сімвалістычнымі творамі. Гэта значыць, што ён пісаў творы, у якіх звяртаўся да вобразаў-сімвалаў, у якіх часта ўцякаў ад рэчаіснасці свайго часу ў свет надзорных вышынь, паэтычных абстракцый.

І гэта мае сваю зусім пэўную законамернасць. М. Багдановіч—прадстаўнік беларускай інтэлігенцыі, якая з прычыны прыгнёту царскага самаўладства не мела магчымасці разгарнуць свае сілы і таму часта ўпадала ў нявер'е, песімізм.

Уяўны і таемны культ лясуноў, русалак, ледзь прыкметных фарбаў прыроды займаюць вялікае месца ў творчасці Багдановіча. Прычым гэтыя з'явы часта авеяны роспаччу. Вось стварэецца малюнак леса і ў ім лясун, які ў прадчуванні блізкай пагібелі крычыць у прасцяг:

„Ці не гукнуць, каб рэха па лесе пайшло,
Каб з касцямі ў кавалкі разбітымі
Нехта біўся ў крыві, каб мне можна было
Усю ноч рагатаць пад ракітамі.

І вось другі малюнак пугача, які чуе пах сваёй ахвяры

Лякаючысь, канца чакаеш ночы,
Усё здаецца ўстаў лясун вялікі—
Чырванеюць, адбіваюць кроўю вочы,
Не змаўкае смех глухі і дзікі.


25. 04. 2009

На многія аб'екты сваёй творчасці і факты рэчаіснасці паэт пераносіць настроі свае надломленае хваравітае псіхікі і ў гэтым выпадку жудасць, якая вее ад вобразаў лясуна і пугача, з'яўляецца жудасцю, што ахапіла самога паэта.

У Багдановіча мы знаходзім рад вершаў, якія гавораць пра ўпадніцкі, песімістычны, душэўны стан паэта. Адзін верш так і называецца „Цемень". Цемень, што пануе ў душы паэта, што ахапіла ўсе яго пачуцці, выражае гэты верш.

Я сяджу без агню. Я стаміўся, прамок.
Над зямлёю імгла, у душы маёй змрок.
О, як пуста ў ёй! О, як холадна жыць!
Але вось цераз цемень маланка блішчыць.
Асвячае мне вобраз Хрыста... яго крыж...
Ажываеш, здаецца, душою гарыш.
Але толькі чаму так малы гэты час?!
Зноў навокала цемень. Свет зірнуў і пагас.
Не глядзіць на мяне ясны вобраз Хрыста.
Над зямлёю імгла, у душы пустата.

Верш тыпова сімвалістычны. Адразу адчуваеш, што выражае тут свае думкі чалавек, далёкі ад веры ў будучыню. Адзінае, што на момант можа „асвяціць" душу чалавека, гэта „вобраз Хрыста, яго крыж". Аднак-жа толькі на адзін момант, а далей змрок, безнадзейнасць. Сімвал Хрыста, як надземнае існасці, што ачышчае чалавека ад бруду зямнога існавання, і з'яўляецца тут ідэалам паэта. Такія настроі не выпадковыя і не мімалётныя для творчасці М. Багдановіча. У вершы „Дзябольскаму" выражана тая-ж ідэя: ад жыцця больш чакаць няма чаго, пэўнае жыццёвае кола завершана, далей могуць быць толькі паўторы. Жыццё ў вершы ўяўляецца, як пярсцёнак, пакладзены ў круг і, раз прайшоўшы гэты круг, нельга ўжо дадаць да жыцця штосьці новае, можна адно—паўтараць яго.

І ў гэтым новым свеце пройдзе ўсё
Былое прэда мной...
Хай зноў зварушыцца чуццё
Мінулай пуцінай.

Нявер'е ў творчыя сілы чалавека, захапленне найглыбейшымі, хваравітымі фарбамі прыроды—вось што характэрна для гэтага верша Багдановіча. Прычым, захапленне сваімі асабістымі псіхалагічнымі перажываннямі, таемнымі гукамі і фарбамі прыроды ў М. Багдановіча зазвычай перарываецца бурнымі імклівага рытма вершамі, якія ўжо выражаюць крык набалелай душы. Адчай, роспач гучыць і ў такой думцы, выражанай ў вершы „Шмат у нашым жыцці ёсць дарог, а вядуць яны ўсе да магілы": „Усё жыццё мы спяшаемся некуды, нечага мітусімся, нешта робім. Людзі ахоплены сваркамі, звадкамі, неспакоем. Не! Не гэта трэба чалавеку,—кажа Багдановіч,—патрэбна грамадская

згода, а спяшацца ўсё роўна няма куды, бо нават „Ціха паўзучы чарвяк дагнаў нас ля самай магілы“.

Што і казаць, Багдановіч у вялікай колькасці сваіх твораў гаворыць пра смерць, як пра адзінае выйсце з пакут. Ён у многіх вершах піша пра смерць з дваістым пачуццём: пачуццём жалю па жыццю і з нейкай патайнай унутранай радасцю. Матывы смерці ў творчасці М. Багдановіча маюць дваістую абумоўленасць. Інтэлігент, які не быў аптымістам у дачыненні да будучыні свайго народа—адсюль матывы смерці ў яго творчасці; другая прычына—прычына біяграфічная, якую таксама ні ў якім разе нельга ігнараваць: Багдановіч у самым росквіце свайго жыцця хварэў туберкулёзам, хвароба падрывала яго сілы і на 26 годзе жыцця звяла яго ў магілу. Ігнараваць хоць-бы адну з гэтых двух прычын было-б няправільна.

Не малае значэнне меў у гэтым сэнсе і ўплыў на паэта сімвалістычнай школы.

У многіх сваіх вершах М. Багдановіч гаворыць пра сябе, як пра „бальнога бескрыдлага паэта“, пра тое, што „жыцця яго верш ужо спет“. Даволі прыгадаць тут цудоўны па форме, незвычайна цэльны па кампазіцыі і яркі па сіле пачуцця верш „Не кувай ты, шэрая зязюля“, дзе выражаецца тая-ж думка:

Не кувай ты, шэрая зязюля,
Сумным гукам у бары;
Мо'і скажаш, што я жыці буду,
Але лепш не гавары.
Бо не тое сведчыць маё сэрца,
Грудзі хворыя мае;
Боль у іх мне душу агартае,
Думцы голас падае.
Кажа, што нядоўга пажыву я,
Што загіну без пары...
Прыляці-ж тады ты на магілу,
Закувай, як у бары.

Такім чынам першы вывад з разгляда творчасці М. Багдановіча можна выразіць наступным чынам: у некаторых творах М. Багдановіч выражаў пачуцці безнадзейнасці, бязвер'я ў дачыненні да будучыні. Літаратурная школа М. Багдановіча—сімвалізм і таму ён у многім пераклікаецца з рускімі сімвалістамі таго часу (Бальмант, Блок, Брусаў). Уцякаючы ад ненавіснай яму рэчаіснасці ў таемны свет надзор'яў, захапляючыся русалкамі, лясунамі, вадзяннікамі, Багдановіч браў часамі містычныя бакі сімвалізма. Нацыянальнае прыгнечанне беларускага народа царскім самадзяржаўем, адсутнасць мажлівасці ў інтэлігенцыі разгарнуць свае сілы—усё гэта стварала разлад пісьменніка з рэчаіснасцю, усё гэта кідала яго і на захапенне „мастацтвам для мастацтва“. Найбольш ярка выражана яно ў вершы „Апокрыф“.

У „Апокрыфе“ аўтар праз вусны Хрыста вось што кажа пра ўзаемаадносіны спажытку і „прыгаства“, „чыстага мастацтва“:

„Няма красы без спажытку, бо самая краса і ёсць той спажытак, дзеля людзей“.

І далей, паказваючы на ніву:

„Цяжка працаваў ля яе (нівы—А. К.) гаспадар і вось бачыць паміж збожжа ўзраслі васількі. І сказаў ён ў сэрцы сваім: „Хлеб адбіраюць у мяне гэтыя сінія кветкі, бо поўныя вагі каласы маглі-б узрасці на месцы васількоў. Але яшчэ з маленства краса іх прышлася мне да душы. Таму я не вырву з каранём іх, як усякае благое зелле. Няхай растуць і радуюць, як у маленстве, сэрца маё. І не падняў ён рукі на васількі... Добра быць коласам, але шчаслівы той, каму давялося быць васільком. Бо на што каласы, калі няма васількоў“.

У гэтых словах выражаны ўсе аргументы аўтара ў абароне „хараства для хараства“. Хараство вышэй усяго і нават не хараство служыць дадаткам да матэрыяльных здабыткаў чалавека, а наадварот, матэрыяльныя здабыткі служаць дадаткам да хараства. „Бо нашто каласы, калі няма васількоў!“

У творчасці Багдановіча пераважаюць не моманты ідэалізацыі мінуўшчыны, а паказ нацыянальнай прыгнечанасці Беларусі, барацьбы за нацыянальнае вызваленне народа.

Максім Багдановіч заклікае інтэлігенцыю змагацца за вызваленне народа з-пад нацыянальнага ўціску:

Цісне сэрца маё песня начная...
Хай-жа голасна вецер спявае,
Хай пяе ён у роднай зямлі,
Каб у сэрцы нам сорам збудзіць
Каб змагацца з няпраўдай ішлі
Ў чыім сэрцы сумленне не спіць
Долю чорную ноч не схавае,
Калі выллецца песня жывая!

У другім вершы М. Багдановіч пытае інтэлігенцыю, ці хопіць ёй сілы „без скарг легчы ў магілу“ калі яго „родзіна-маць ў змаганні з нядоляй патраціць апошнія сілы“.

У вершы „Народ, беларускі народ“ Багдановіч паказвае прыгнечанне народа ў сувязі з прыгнётам яго мовы.

Народ, беларускі народ,
Ты цёмны, сляпы, быццам крот,
Табой ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма.
І душу тваю абакралі,
У ёй нават мовы няма.

Надзівa яркі малюнак забітай беларускай вёскі намаляваў паэт ў вершы „Краю мой родны, як выкляты богам“.

М. Багдановіч—чалавек усебаковага і вялікага запасу куль-

туры быў незвычайна добра знаёмы з выдатнейшымі творамі рускай і заходне-еўрапейскай літаратуры і сам пісаў на рускай мове. Стыхійнае цягненне да культуры, створанай іншымі народамі, і ў першую чаргу да вялікай рускай культуры, рабіла тое, што паэт вельмі часта вырываўся з абмяжаваных нацыянальных рамак. У гэтым ён на многа стаіць вышэй многіх нашаніўскіх пісьменнікаў, якія вясковую абмяжованасць і шавінізм ставілі за прынцып свае творчасці.

Аднак вернемся да прыкладаў. Возьмем верш „Мяжы". Гэта верш накіраваны супроць меж і платоў, якія паўсталі па ўсёй зямлі. Гэтыя межы—усё няшчасце, усё гора чалавека. Паэт у вершы ўздымаецца нават да пратэста супроць прыгнёта і эксплаатацыі.

Побач, што робіцца за гэтымі платамі,—піша ён.

У надмернай працы гіне тут
Галодны і абдзёрты люд,
Каторы моцнымі рукамі
Стварыў усе багацці на зямлі.
. . . . . . . . . . . . . . .
Так многа ёсць паўсюль багацця і красы,
А людзі нішчацца ў голадзе, у зморы
Ад беднаты, ад цемнаты
Бо скрозь мяжы, бо скрозь платы...

Верш „Мяжы" сапраўдны абвінаваўчы акт памешчыцка-капіталістычнаму ладу, ладу нацыянальнай грызні і абмяжованасці. Гэтую абмяжованасць М. Багдановіч ненавідзіць, пачынаючы ад асобнай хаты абведзенай „вострым парканам" і „бітым шклом", ад сялянскіх палос на ніве, аддзеленых канавамі і канчаючы „стопудовымі гранічнымі каменнямі" і „шнурамі штыкоў па ўсёй зямлі, якія

Гараць, як дзікае хаценне,
На гасударстваў рубяжы.

Ужо верш „Мяжы" паказвае, што ў асобе М. Багдановіча—мы мелі паэта, які выражаў прагрэсіўныя, перадавыя тэндэнцыі і ідэі свайго часу.

Гэтыя прагрэсіўныя ідэі выяўляюцца і, у так званай, яго сялянскай лірыцы. Кажуць, што, паказваючы і аплакваючы гора селяніна, паэт не даваў выйсця з гора сялянству, аднак на справе гэта не зусім так.

У вершы „З песень беларускага мужыка" вельмі смела вуснамі мужыка кідаецца пагроза ў твар багатых.

Я хлеба ў багатых прасіў і маліў
Яны-ж мне каменне давалі.
І тыя камені між імі і мной
Сцяною вялізнаю ўсталі.

Яна ўсё вышэй і вышэй расце,
І шмат каго дужа лякае
Што-ж будзе, як дрогне, як рухне яна.
Каго-ж пад сабой пахавае.

І ў другім вершы гэтага-ж цыкла селянін заяўляе пра свае „мазольныя працавітыя рукі“ смела на ўвесь свет:

Працаваў над пяском, над дрыгвою
І не мала там выцерпеў мук
І не прыдзецца мне пад зямлёю
Гэтых чорных сароміцца рук.

Праўда, ствараючы такую праўдзівую карціну соцыяльнага прыгнёта, М. Багдановіч гэтым не абмяжоўваецца, а імкнецца ў вусны селяніна ўкласці свае погляды і настроі. Селянін пачынае прасторна філасофстваваць, што жыццё нішто „смерць будзе сапраўдным збавеннем“, што для такога жыцця „не варта было-б і раджацца“. Тут паэт свае ўпадніцкія настроі пашырае і на аб‘екты свае творчасці.

Памылковым, аднак, было-б лічыць, што ўсе творы М. Багдановіча песімістычныя і пазбаўлены веры ў будучыню. Наадварот, мы маем вялікую колькасць вершаў Багдановіча дзе ёсць вера ў будучыню. І такія творы мы таксама павінны аднесці да лепшых прагрэсіўных твораў паэта („Прыдзе вясна“, „Вышаў з хаты“, „Рушымся, брацці хутчэй“). У адным з вершаў М. Багдановіч заклікае „устань навальніца—мкні нанава“. У другіх вершах ён гаворыць пра агонь, які слабеў і „ўрэшце згас“ і ўсё-ж „хай шэры попел, ты агнішча ўсё сабою, у нядоўгі час, здолей як рызаю пакрыць, я ведаю, што там чырвоны жар гарыць“.

Хай чарада гадзін панурых, нудных, шэрых
Як попел на душу мне клаліся ўвесь час,
Хаваючы сабой агонь гарачы веры,—
Хай не відаць яго... а ўсе-ж ткі ён не згас.

Сярод рамантычных твораў М. Багдановіча зусім адменнае, асаблівае мейсца займаюць такія творы, як „Страцім лебедзь“ і „Эміграцкая песня“. „Страцім лебедзь“ гэта ўсхваленне ўсяго гераічнага, магутнага, а не нізменнага, слабага і мізэрнага. Ва многім „Страцім лебедзь“ перакідваецца з Горкаўскай песняй „Пра сокала“, хаця ў адрозненне у „Страцім лебедзі“—М. Багдановіча цікавіць выключна культ рамантычнага і гордага, як абстракцыя, як абсалют. Ной будуе свой каўчэг і да яго каўчэга плывуць усе птушкі, не плыве толькі горды птах „Страцім лебедзь“. Лінулі ліўні „горды птах лётае над прасторамі вод, але дробныя і паганыя птушкі панасядалі на яго і пагубілі „Страцім лебедзя“. Верш па сваёй мастацкай сіле, адзін з самых выдатных у паэзіі М. Багдановіча.

Простыя, адпаведныя народнай творчасці і магутныя словы ўзяў паэт для характарыстыкі Страцім-Лебедзя:

Страцім-лебедзь—горды, моцны птах.
Яго звычаі—арліныя;
Яго ўцехі сакаліныя;
Пер'і—пер'ечкі бялеюцца
Ды на золку агнявеюцца.
. . . . . . . . . . . . . .
Узмахне крылом—быццам бор шуміць,
Узмахне другім, што мяцель гудзіць.

альбо:

А па ўсёй зямлі толькі хвалі б'юць
толькі хвалі б'юць белай пенаю.
Ды па ім дужы, смелы плавае
Страцім-лебедзь горды моцны птах.

Але прачытайце верш да канца і ў ім, дзе ўсхваляецца ўсё незвычайнае, магутнае і непакорнае, дзе па сутнасці ўсхваляецца горды і непакорны дух чалавека, гучыць усё тая-ж старая і сумная думка: быў горды птах калісьці ў мінулым, але цяпер яго няма і ў будучым не будзе.

Ад усіх (птахаў А. К.) цяпер патомкі ёсць
Ды няма адно—Страцімавых.

Так песімістычна канчаецца гэты цудоўны, напісаны з вялікім паэтычным натхненнем і сілай, верш М. Багдановіча.

Вялікая сіла гучыць у другім вершы паэта „Эмігранцкая песня". Верш гэты надзвычайна цікавы для ідэйнага аблічча М. Багдановіча. Мы ўжо вышэй гаварылі, што з аднаго боку М. Багдановіч абмежаваны ў захапленні выключна Беларуссю, а з другога боку вялікі талант мастака вельмі часта вырывае яго з гэтай абмежаванасці, прычым паэт тут не заўсёды паслядоўны. Гэта вельмі яскрава адлюстравана ў вершы „Эмігранцкая песня". Не будзім строга судзіць паэта за тое, што ён усхваляе ў ёй бадзягаў, важна тое, што ён у песні славіць чалавека, не прыкаванага да буржуазнай бацькаўшчыны, чалавека вялікіх мар і імкненняў, чалавека, якому аднолькава родны ўсе краіны:

Ёсць на свеце такія бадзягі,
Што не вераць ні ў бога, ні ў чорта
Ім прыемны стракатыя сцягі
Караблёў акіянскага порта
І няма ім каго тут пакінуць
Бо нікога на свеце не маюць
Усё ім роўна: ці жыць, ці загінуць,—
Аднаго яны моцна жадаюць

Пабываць у краёх незнаёмых,
Ды зазнаць там і шчасця і гора,
І загінуць у хвалях салёных
Белапеннага сіняга мора.

Чытаючы цытаваныя радкі мы адчуваем спачуванне паэта да такіх людзей. Праз строй паэтычных радкоў праходзіць грозная рытміка морскіх хваляў, адчуваем размах, шырыню сапраўднае паэзіі. Але паэт непаслядоўны. Пасля гэтых агнявых радкоў, у якіх ён усхваляе людзей, не прыкаваных да меж свае радзімы, ён піша, што яму „свой край мілей за ўсё“, ён бы „не расстаўся з ім“ і ўвесь час „маячыцца вёсачка, Нёман і агні партавыя Лібавы“, г. зн. „родная Беларусь“ яму мілей за ўсё.

Праўда, у гэтым вершы мы маем праўдзівае абгрунтаванне гэтай любві да Беларусі ў радках: „Не расталіся-б мы з нашым краем, каб было дзеля нас усіх хлеба“. Асобна трэба сказаць аб вершы „Слуцкія ткачыхі“, у якім таксама ставіцца праблема „нацыянальнага“. „Ад родных ніў, ад роднай хаты, у панскі двор дзеля красы, яны бяздольныя ўзяты ткаць залатыя паясы“. Выключная тэма эксплаатацыі прыгоннікамі не толькі фізічных, але і духоўных сіл народа. І канцоўка, якая апавядае нам аб тым, што „тчэ бяздольная рука паміж персідскага ўзора цвяток радзімы васілька“, з‘яўляецца вельмі праўдзівым адлюстраваннем пачуццяў душы беларускай жанчыны.

Максіма Багдановіча ў многіх вершах і празаічных творах займалі пытанні эстэтыкі, пытанні прыгаства.

Максім Багдановіч надаваў велізарнае значэнне фармальнай выкаўцы верша, прыгаству яго, разумеючы гэту фармальную выкаўку, як сродак яшчэ больш магутнага ўздзеяння на чытача. У вершы „Песняру“ ён гаворыць, што сэрцы людзей быццам з халоднага каменя, а для таго, каб здабыць з гэтага сэрца іскру пачуцця (радасці, роспачы) трэба ўдарыць па гэтаму сэрдцу сталлю.

Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш,
Абрабіць яго трэба з цярпеннем.
Як ударыш ты ім,—ён, як звон, зазвініць,
Брызнуць іскры з халодных каменняў.

У некаторых вершах і апавяданнях Багдановіч растлумачвае нам геніяльную сутнасць рафаэлеўскай Мадонны. У прыватнасці гэтай тэме прысвечаны верш „У вёсцы“. У ім аўтар, які ідзе ў гарачы спякотны дзень па пустыннай вясковай вуліцы, бачыць дзяўчынку, якая суцяшае зусім малое дзіця. І вось у твары гэтай дзяўчынкі-падлётка паэту мільганулі ўжо рысы мацеры. У гэтым,—гаворыць Багдановіч,—геніяльнасць рафаэлеўскай Мадонны: праз рысы дзявочага, яшчэ амаль дзіцячага твару праглядваюць выразна рысы мацярынства.

У сувязі з гэтай праблемай стаіць праблема лёсу жанчыны—мацеры ў творах Багдановіча. Гэта праблема вырашаецца Багдановічам пераважна ў трагічным плане: жанчына ў муках нараджае дзіця, але сама памірае. Яна, гэта жанчына „пачуццю цёмнаму падлеглая" адчувае ўжо сваю смерць загадзя. Вось міма вакна прайшла з страшнай кляцьбой цыганка, вось прамільгнуў нейкі невыразны цень, і жанчына пабляднела ў нямой трывозе. Гэта поўніць яе сэрца нядобрымі прадчуваннямі.

Затое дзеці ў Багдановіча—гэта ўвасабленне чыстаты, радасці бесклапотнасці:

Гэты мілы белы пальчык
Тоненькі, кароткі
Усё ў рот бярэ мой мальчык,
Надта ўжо салодкі.

Такім чынам мы бачым, што велізарная любоў да чалавека, боль за яго пакуты выражаецца ва ўсіх тэмах, якія вырашае гэты выдатны—паэт—гуманіст.

З разгляда творчасці М. Багдановіча ясна, што мы маем справу з буйным майстрам верша. М. Багдановіч выкарыстоўваў у сваёй паэзіі незвычайна вялікую колькасць форм класічнага верша. Але не ў гэтым яго мастацкая сіла. Яго мастацкая сіла ў фармальнай цэльнасці і закончанасці твора. У яго няма „беспредметных" вершаў, кожны самы найменшы верш мае поўную закончаную, ярка—выражаную думку. У Багдановіча можна вучыцца кампазіцыйнай цэльнасці невялікага лірычнага верша. Выказаная думка не застаецца толькі неясным намёкам, яна мае сваё паступовае лагічнае развіццё і вывад, часамі раптоўны, нечаканы, арыгінальны. Нават ў невялічкім творы ў Максіма Багдановіча кожны вобраз або азначэнне з'явы няўхільна і лагічна вынікае з папярэдняга. Возьмем для прыкладу верш „Разгарайся хутчэй, мой агонь, між імглы". У вершы 8 радкоў. Але ў ім усё заканамерна. Агеньчык павінен абавязкова разгарэцца, і тады няхай яго „шум вятроў не пужае", бо зусім ясны паэтычны незвычайна-глыбокі і лагічна апраўданы вывад:

Пагашаюць яны аганёчык малы
А вялікі—крапчэй раздуваюць.

А калі агеньчыку і давядзецца памерці, дык у помсту за яго смерць людзей павінен агарнуць жахам „страшны абступіўшы іх мрок" і каб, урэшце, з гэтай прычыны людзі

...агнёў не гасілі-б ніколі.

Вось такая высокая прыдуманасць, зладжанасць усіх частак твора і з'яўляецца адзнакай сапраўднага мастака. Думка адзіная, але мае некалькі варыяцый. Агонь павінен жыць: ці то ён сам павінен разгарэцца магутны, ці павінен вакол людзей ства-

рыць жах цемры, каб яны агнёў не гасілі ніколі. Такая-ж закончанасць і яснасць ва ўсіх санетах паэта.

Максім Багдановіч незвычайна ўпарта працаваў над выкаўкай свайго верша. У яго дасканалая свежая рыфма, часта асанансы і высокая ступень алітэрацыі, гукапераймальнасці. У вершы „Завіруха" гукапераймальнасць такая высокая, рытміка такая бурная, што мы адчуваем завіруху, яе дыханне.

У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.
Ускіпела снежнае віно,
І белай пенай мкне яно.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе,
Па вулках вее дзікі хмель,
Гудзіць сп'янелая мяцель.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.

Вельмі шмат прыгожых вершаў напісаў М. Багдановіч аб прыродзе. Пры чым успрыманне прыроды ў паэта нейкае асаблівае. Гэта пераважна ціхія карціны, якія могуць паслужыць тэмай філасофскага разважання. Малюнак прыроды. Млынар. Дзяўчына ў белым. Таямнічая варажба. Млынар—пырскае ваду на твар і заклінае дзяўчыну. І, нарэшце, нечаканая канцоўка: дзяўчынка ў белым падносіць яму яйкі ў рэшаце і палатніну. Па ўнутранай, можна сказаць, сіле першабытнага пачуцця, па адпаведнасці вялікім карцінам народнага эпаса верш „Ціхі вечар" побач з такімі вершамі як „Блішчыць у небе зор пасеў", „Цёплы вечар", „Добрай ночы" і інш. з'яўляецца адным з лепшых у творчасці Багдановіча.

Ціхі вечар; знікнула спякота,
Весялей струіцца між чарота
Рэчка, што ўцякае у ставок;
Ўкруг яго ідзе вярбін вянок
Йшчэ зялёных, свежых, хоць каравых;
Плесня каля берагоў іржавых
Саматканым поясам ідзе,
І лілеі расцвілі ў вадзе.
Часам з візгам ластаўка малая
Пранясецца нізка і чыркае
Крылечкам з разгону гладзь стаўка,
Налякаўшы гэтым матылька.
. . . . . . . . . . . . . . . . .
Але сёння ходзіць кола млына,
Бо прышла да млынара дзяўчына,
Кабы мог сукруху з сэрца збыць.
У белай вопратцы яна стаіць,

Нахіліла смуглую галоўку,
І чуваць, як сэрца праз шнуроўку
Часта б'ецца. А стары млынар
Тройчы брызнуў ёй вадой на твар
І, уставіўшы у хвалі вочы,
Прыглушоным голасам шапоча:
„Пакланюся я табе, царыца,
Чыстая, сцюдзёная вадзіца.
Ты цячэш балотамі, і мхамі,
Жоўтымі сыпучымі пяскамі.

. . . . . . . . . . . . . .

І прыносіш ты туды, вадзіца,
Важкі сум ад сэрца Кацярыны.
Я навокал абваджу тры тыны,
На замок іх моцна замыкаю,
Ключ у мора—акіян кідаю.
Як са дна ключу ўжо не падняцца,
Так і гэтым словам не мінацца".
І падносіць млынару дзяўчына
Яйкі ў рэшаце і палатніну.

Асноўнае, што характарызуе М. Багдановіча як сапраўднага мастака і адрознівае ад некаторых сучасных яму беларускіх пісьменнікаў—гэта адсутнасць дробнае, а часам анекдатычнае, вясковае бытаўшчыны, ўзвышэнне тэмы, своеасаблівае „аблагараджванне" яе, узвядзенне яе да ступені філасофскае.

І па-другое: прэдзельная кандэнсацыя верша, стройнасць і закончанасць думкі з'яўляецца ўзорнай у Багдановіча. Нарэшце, пра яго можна сказаць тое, што ім сказана пры характарыстыцы твораў Купалы „буйны, шпаркі рытм".

Усё гэта ставіць Багдановіча ў першарадныя майстры слова ў дарэвалюцыйнай беларускай літаратуры.

62036

---

Адказны рэдактар Е. Калубовіч.

Здана ў друкарню 13/XII 1939 г. Падпісана да друку 16/XII 1939 г.
Аб'ём 1 друк. арк. Папера 60×92. Тыраж 1000 экз. Заказ № 1017.
Уп. Галоўлітбелу № 681.

Друкарня Акадэміі Навук БССР.

БЯСПЛАТНА

1 984 г.

1934 г.

B000000 1962419